шматлікімі перагародчатымі каляровымі эмалямі з выявамі святых, арнаментальнымі кампазіцыямі, 8 каштоўнымі авальнай формы камянямі. Размяшчэнне святых нагадвае іканапісную кампазіцыю пашыранага дэісуса. Унізе крыжа выявы святых Ефрасінні, Соф'і і Георгія. Бакі крыжа абкладзены пазалочанымі пласцінкамі з серабра. На іх па спіралі ў 2 рады прасечаны доўгі надпіс. У ім паведамляецца, з якіх матэрыялаў зроблены крыж, калі зроблены, колькі каштуе, імя майстра і традыцыйнае заклінанне: «Г/оспод/и помози рабоу своемоу Лазорю нареченомоу Богъши, съделавъшему крьст сии црькви святого Спаса и Офросиньи». Крыж да 1941 г. зберагаўся ў Магілёўскім краязнаўчым музеі. У Вялікую Айчынную вайну выкрадзены нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Літ.: Кацер М. С. Изобразительное искусство Белоруссии дооктябрьского периода.— Мн., 1969; Каргер М. К. Живопись.— У кн.: История культуры древней Руси. М.; Л., 1951, т. 2; Шчакаціхін М. Фрэскі Полацкага Барысаглебскага манастыра.— Наш край, 1925, № 1; Штыхаў Г. В. Полацкія фрэскі XII стагоддзя.— Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1970, № 1; яго ж. Полацкі шэдэўр XII стагоддзя.— Там жа, 1973, № 2; яго ж. Древний Полоцк. IX—XIII вв.— Мн., 1975; Монументальная живопись.— У кн.: Очерки по археологии Белоруссии. Мн., 1972, ч. 2; Монгайт А. Л. Фрески Спас-Ефросиниевского монастыря в Полоцке.— У кн.: Культура древней Руси. М., 1966; Сяліцкі А. А. Старажытныя фрэскі.— Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1978, № 3; яго ж. Старажытны полацкі жывапіс (XI—XII стст.).— Мастацтва Беларусі, 1984, № 4, 6; Алексеев Л. В. Лазарь Богша — мастер-ювелир XII в.— Советская археология, 1957, № 3; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Т. 1.— Мн., 1968; Всеобщая история архитектуры. Т. 3.— Л.; М., 1966.

Г. В. Штыхаў, Т. І. Чарняўская, В. В. Церашчатава.

1888. ЧЫРВОНЫ МОСТ (гіст.). На вул. Фрунзе, цераз р. Палата.

У Айчынную вайну 1812 г. баі за вызваленне Полацка пачаліся амаль адначасова з наступленнем рускай арміі пад Масквой. На той час корпус П. Х. Вітгенштэйна займаў зручныя пазіцыі на р. Дрыса. Падмацаваныя Пецярбургскім апалчэннем і рэзервамі (50 тыс. чалавек, 170 гармат), часці корпуса 5 кастрычніка атакавалі пазіцыі праціўніка каля вёсак Юравічы і Белае, 6 кастрычніка захапілі абарончыя ўмацаванні каля Полацка і паўночную ўскраіну горада. У ноч на 8 кастрычніка пачаўся штурм цэнтральнай часткі горада. Высокія берагі Палаты ўскладнялі штурм, але гэта не спыніла рускіх воінаў. Пад агнём праціўніка воіны Пецярбургскага апалчэння імклівым кідком захапілі мост цераз Палату і ўварваліся ў цэнтр горада. Да раніцы Полацк быў поўнасцю вызвалены, напалеонаўскія войскі адкінуты на левы бераг Заходняй Дзвіны і вымушаны былі адступіць. Праціўнік страціў 7 тыс. забітымі, 2 тыс. салдат і афіцэраў было ўзята ў палон. У баі за горад загінула каля 7 тыс. рускіх воінаў. Мост быў залиты крывёю. З таго часу яго называюць Чырвоным.



1888. *Чырвоны мост.*

У 1975 г. на месцы старога драўлянага моста пабудаваны новы са зборных жалезабетонных канструкцый з выкарыстаннем элементаў афармлення былога моста: стылізаваныя па форме ліхтары на тратуарах, медальёны на плітах парапета (чыгун; па форме выцягнутыя па гарызанталі шасцігранніки з рэльефнымі выявамі перакрыжаваных шаблі і ківера на фоне круглага шчыта). Мемарыяльнае значэнне моста падкрэслена чырвонымі пілонамі (па 2 пры ўездах на мост). Каля моста ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

М. В. Кірэйшын.

в. Азіна, цэнтр сельсавета

1889. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі, каля школы. Пахаваны 116 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1960 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Алёшча, Маласітнянскі сельсавет

1890. МАГІЛА САВЕЦКАГА ВОІНА (гіст.). На могілках. Воін загінуў у Вялікую Айчынную вайну. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Арлея, Трудаўскі сельсавет

1891. ГАРАДЗІШЧА (археал.). Мясцовая назва Царкавішча. За 1 км на паўночны ўсход ад вёскі, у лесе, злева ад дарогі ў в. Званае. Займае ўзгорак авальнай формы, вышынёй 20 м. Памер 50×30 м. Гарадзішча ўмацавана 2 валамі вышынёй 2,5 м, ніжэй прасочваюцца яшчэ 2 кальцавыя валы вышынёй 3,5 м і паміж імі 2 равы шырынёй 2,5 м, глыбінёй 1 м. Адкрыў і абследаваў у 1981 г. Ш. І. Бекцінееў. Раскопкі не праводзіліся.

Ш. І. Бекцінееў.

в. Арлова (не існуе), Гаранскі сельсавет

1892. МЕСЦА СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ (гіст.). Вёска Арлова знаходзілася за 5 км на паўднёвы захад ад в. Новыя Гараны. У чэрвені 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі загубілі 21 жыхара і знішчылі вёску (10 двароў). Пасля вайны не адрадзілася. Увекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

в. Арцейкавічы, Азінскі сельсавет

1893. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 500 м на паўночны ўсход ад вёскі. Пахаваны мірныя жыхары навакольных вёсак, загубленыя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1943 г. У 1974 г. на магіле пастаўлены абеліск.

1894. МАГІЛЫ АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 3 мірныя жыхары, якіх загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў жніўні 1941 г. На магілах устаноўлены мемарыяльныя знакі.